***К.І. Лапанік, А.Ю. Нядведская***

БДЭУ (Мінск)

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

У другой палове XI – першай палове XII стагоддзяў Полацкае княства дасягнула высокага ўзроўню развіцця, ўсталявала трывалыя гандлёвыя і культурныя сувязі з краінамі Усходу і Захаду. Нягледзячы на захаванне язычніцкіх уяўленняў, у духоўным жыцці княства працягвала ўмацоўвацца хрысціянская ідэалогія. Хрысціянскія ідэі заваёўвалі ўсё больш прыхільнікаў. Асабліва важную ролю ў распаўсюджанні хрысціянства на беларускіх землях адыграла унучка Усяслава Чарадзея князёўна Прадслава (XII ст.), больш вядомая як Еўфрасіння Полацкая.

Еўфрасіння Полацкая нарадзілася ў сям’і полацкага князя ў пачатку XII ст. Дзякуючы бацькам, якія былі па тым часе адукаванымі людзьмі, атрымала добрае хатняе выхаванне. Яно прадугледжвала веданне царкоўна-славянскай мовы, а таксама грэчаскай мовы. Не жадаючы выходзіць замуж, у маладым узросце пастрыглася ў манахіні і пасялілася ў келлі Полацкага Сафійскага сабора, дзе вяла пустэльніцкі вобраз жыцця, працягвала самаадукацыю, жадала прысвяціць сябе навуковай і асветніцкай працы, авалодаць тагачаснай кніжнай мурасцю і перадаць яе іншым людзям.

Крыніцай для вывучэння жыцця і грамадска-палітычных поглядаў з’яўляецца «Жыціе Еўфрасінні Полацкай» – помнік старажытнабеларускай гісторыка-палітычнай думкі, у якім прысутнічаюць звесткі аб духоўным узвышэнні Еўфрасінні Полацкай, яе жыццё і ўздзеянне на палітычнае жыццё Полацкага княства і княстваў Полацкай зямлі.

Еўфрасіння Полацкая сыграла важную ролю ў працэссе ўмацавання пазіцыі хрысціянскай ідэалогіі на Полацкай зямлі, была прыхільніцай народнай асветы. Яна вельмі жадала развіць у народзе хрысціянскія дабрачыннасці праз асвяшчэнне ўсяго што магло служыць хрысціянству, гэта і школьная справа, і перапісванне святых кніг, і іканапіс. Займалася перакладамі рэлігійнай і маральна-філасофскай літаратуры з грэчаскай на царкоўна- славянскую мову,

чым значна ўзбагаціла ўсходне-славянскую духоўную культуру таго часу. Існуе меркаванне, што ёю былі закладзены таксама асновы летапісання ў Полацку.

Еўфрасіння падтрымлівала культурна-выхаваўчую і адукацыйную функцыю дзяржавы. Пад яе рукаводствам ствараліся манастырскія школы, у якіх вывучаліся не толькі традыцыйныя дысцыпліны, але і гістарыя Полацкага княства.

Еўфрасіння пабудавала ў Полацку жаночы і мужчынскі манастыры, была фундатарам пабудовы царквы святога Спаса (зараз Спаса-Еўфрасінеўская царква ў Полацку). Паводле заказа Еўфрасінні полацкім майстрам Лазарам Богшам у 1161 годзе быў зроблены 6-канцовы крыж для царквы святога Спаса (страчаны ў часы Вялікай Айчыннай вайны, адноўлены ў наш час).

Аснову грамадска-палітычных поглядаў Еўфрасінні Полацкай складалі хрысціянскія запаветы, яе думка і дзейнасць былі скіраваны на дабрабыт і росквіт роднай зямлі.

У духоўным свеце Еўфрасіння ставіла на першае месца ідэю служэння Богу і вышэйшым духоўным каштоўнасцям. Сэнс гэтага служэння асветніца бачыла ў сцвярджэнні новых хрысціянскіх маральных прынцыпаў існавання чалавека. Сваю асветніцкую дзейнасць Еўфрасіння сумяшчала з актыўным удзелам у грамадскім і палітычным жыцці Полацкага княства. Яна выступала супраць княжацкіх усобіц, заклікала да міру, ўзаемаразуменню паміж людзьмі, клапацілася пра асвету народа, аб захаванні яго культурных традыцый, аб гуманных метадах кіраўніцтва . Менавіта таму імя Ефрасінні Полацкай захавалася да нашых дзен і стала нацыянальным сімвалам беларускага народа, прыкладам служэння свайму народу. Такім чынам, станаўленне асобы Ефрасінні Полацкай адбывалася ў перыяд найвышэйшага росквіту Полацкага княства. Юная князёўна абрала сабе шлях іншы ад лёсу жанчын  яе кола. З ранняга дзяцінства ўвабрала яе душа адгалоскі язычніцтва ў традыцыях і каштоўнасці хрысціянства.

Вобраз Еўфрасінні Полацкай набыў вышэйшую якасць нацыянальнага сімвала, самаадданага служэння высакародным ідэалам вернасці сваёй айчыны. Яна асветнік- рэфарматар, палымяны падзвіжнік на ніве народнай адукацыі.